# Беларуская народная казка «Залаты птах»

Прачытай урывак з беларускай народнай казкі «Залаты птах».

…— А зараз, — кажа ваўчыха, — сядай зноў на мяне. Паплывём за мора.

Пераплылі мора. Бачыць Іван — стаіць на беразе мора залаты палац. Ваўчыха кажа:

— Ідзі ў гэты палац. Толькі паціхусеньку, памалюсеньку, бо гэта зачараваны палац: усё ў ім спіць. Але калі ты неасцярожна дакранешся да чаго, то ўсё абудзіцца, і тады жывым табе адтуль не выбрацца. Як увойдзеш у браму, убачыш там двух сабак. Яны на жалезных ланцугах да слупоў прыкутыя. Глядзі ж, не пабудзі іх, бо як забрэшуць яны, то ўвесь палац на ногі ўзнімуць. Мінеш гэтак браму, увойдзеш у першы пакой. Там вісіць меч бразгучы. Ён залаты, дарагімі камянямі аздоблены. Але ты яго не чапай, бо ён пачне бразджаць і ўсіх пабудзіць. Увойдзеш у другі пакой, там вісіць гадзіннік пявучы, і яго не чапай, а ідзі проста ў трэці пакой: у ім убачыш залатую клетку, а ў той клетцы і сядзіць залаты птах. Вымі яго асцярожна з клеткі і сам вяртайся да мяне.

Пайшоў Іван у зачараваны палац. Мінуў браму з сабакамі, увайшоў у першы пакой, у другі. Бачыць — розных майстроў тут безліч: і сталяры́, і слесары, і муляры. А каля іх варта з шаблямі ды стрэльбамі. І дзе хто што рабіў, там і заснуў. Падзівіўся Іван на іх ды пайшоў далей, у трэці пакой.

Вось перад ім і залатая клетка вісіць, а ў ёй залаты птах сядзіць. Як убачыў Іван птаха-злодзея, дык і на перасцярогу забыўся. Схапіў клетку, сарваў са сцяны. І тут такі звон пайшоў... Напалохаўся Іван ды назад. У другім пакоі зачапіўся за залаты гадзіннік.

Той давай спяваць, на ўсе лады выцінаць. Пабег Іван далей. Ускочыў у першы пакой, схапіў меч — вельмі ж ён прыгожы быў! А меч як забразджыць... Усё ў зачараваным палацы абудзілася. Усе кінуліся за Іванам. Ды Іван не драмаў — як страла праляцеў каля сабак і выскачыў з палаца.

Бачыць ваўчыха — бяда: Іван імчыцца на ўвесь дух, а за ім цэлая пагоня. Падскочыла да яго ваўчыха.

— Сядай, — кажа, — на мяне хутчэй!

Сеў Іван, а ваўчыха — у мора і паплыла. Пераплыў Іван мора і просіць ваўчыху:

— Скажы, дзе мае браты. Я не магу без іх дадому вярнуцца.

— Эх, — уздыхнула ваўчыха, — не шукай ты братоў, яны цябе са свету звядуць.

— Не звядуць, — адказвае Іван.

— Ну, калі ты такі смелы, то ідзі на каралеўскі двор — там твае браты ў астрозе сядзяць. Толькі глядзі, сцеражыся іх... Яны табе дабра не жадаюць.

Развітаўся Іван з ваўчыхай, падзякаваў ёй і падаўся на каралеўскі двор. Прыйшоў да караля, прывітаўся.

— Што скажаш? — пытаецца кароль.

— Выпусці маіх братоў, — кажа Іван.

— Навошта ты іх у астрозе трымаеш? Кароль кажа:

— Не выпушчу. Твае браты хацелі лепшых маіх коней пакрасці. Іван і так і гэтак просіць — не згаджаецца кароль.

— Дык я выкуплю іх. — Чым жа ты выкупіш? Дастаў Іван з-пад світкі залаты меч.

— Вось табе выкуп. Паглядзеў кароль на меч — спадабаўся: такога ў яго няма!

— Ну добра, — згадзіўся кароль, — забірай сваіх братоў. Толькі больш не пускай іх у маё каралеўства. Забраў Іван братоў, расказаў, як дастаў залатога птаха, і пайшлі ўсе разам дахаты…